Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałt...

№ 41 Вільня, Чацьвер 17 Сьнежня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Зьезд дэлегатаў Б.Х.Д.

(13.XII 1931)

Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя, дзеля ажыўленьня сваей працы і блі жэйшай лучнасьці з беларускай вёскай, дзеля праверкі працы сваей арганізацыйнай улады й урэшце дзеля выбараў новай улады, адбывае зьезды сваіх дэлегатаў з мяйсцоў.

Апошні гэткі зьезд адбыўся ў 1928 г. у лістападзе месяцы. Ад гэтага часу прайшло, як бачым, тры гады, і зьезды падобныя не адбываліся. Гэтаму на перашкодзе стаялі розныя прычыны, прадусім—незалежныя ад самой арганізацыі.

Урэшце ўсе перашкоды паканаваны і чародны зьезд адбыўся ў Вільні 13.XII с. г., у ліку больш сотні асоб. Сяляне, прадстаўнікі нашай арганізацыі, ня гледзячы на нявычайна цяжкое іх сучаснае гаспадарчае палажэньне, узяўшы сяго-таго ў торбачку, часта пазычыўшы ў суседа крыху залатовак на білет, з дакладным разуменьнем важнасьці роднай справы, ахвотна прыбылі на зьезд.

Дэлегаты БХД — гэта ня былі звычайныя зьяздовічы. Не. Гэта былі сьведамыя беларусы, а так-жа сьведамыя сябры сваей арганізацыі. Аб гэтым вымоўна сьведча, як ахвярнае іх прыбыцьцё на зьезд, таксама і ўчасьце іх у зьездзе. Справа ў тым, што дэлегаты прынялі неспадзявана дзейнае ўчасьце ў працах зьезду.

Дэлегаты дакладна так-жа адмалявалі абраз жыцьця сяньняшняй беларускай вёскі. Абраз гэты сапраўды жудасны.

Ня гледзячы аднак на гэтую жудасьць жыцьця нашай вёскі, вёска гэта ўсьцяж паглыбляе сваю беларускую нацыянальную сьведамасьць, усьведамляецца палітычна і ня траціць надзеі на лепшае заўтра. Асабліва цікавы ў нашым сяле той факт, што сяло гэта ўжо даскапальна разьбіраецца ў лябірынце беларускіх палітычных груп і групак. Вёска наша сяньня ўжо даскапальна знае, як сваіх прыяцеляў і абаронцаў, так і сваіх здраднікаў, якіх апошнім часам намножылася даволі як у Вільні, так і на сяле. У выніку ўсяго гэтага, як сьцьвердзіў зьезд, давер да БХД, як сапраўды выпрабаванай, стойкай і вернай барацьбіткі за вызваленьне беларускага народу, у народзе гэтым расьце і штораз глыбейшыя запушчае карэньні.

Урэшце цэлы рад прынятых зьездам рэзалюцыяў, папраўкі ў праграме і статуце, а так-жа выбары новых уладаў арганізацыі, закончылі сапраўды працоўны дзень зьезду дэлегатаў БХД.

І так, аднавіўшыся і духова і арганізацыйна — да далейшай працы пад сьцягам БХД на беларускай ніве!...

Выбары ўладаў БХД.

Выбраны у Цэнтральны К-т БХД:—інж. Ад. Клімовіч, Якім Красоўскі, М. Дварэцкі, Др. Ст. Грынкевіч, Я. Чарнэцкі, Я. Ярмалковіч, студ. Я. Шутовіч, В. Таўкінь, Б. Бабарыка, рэд. Я. Пазьняк і А. Сенкевіч.

Выбраны ў Рэвізыйную Камісію: Я. Найдзюк, А. Яцына, В. Васілеўскі і студ. мэд. Я. Малецкі.

Выбары Прэзыдыюму.

14.XII с. г. адбылося паседжаньне Ц.К. БХД. На парадку дня быў адзін пункт: выбары Прэзыдыюму. У рэзультаце выбраны: інж. Ад. Клімовіч — старшыня, Я. Красоўскі — 1-шы віцэ-старшыня, М. Дварэцкі—2-гі віцэ-старшыня, рэд. Я. Пазьняк — сэкрэтар, студ. права Я. Шутовіч — скарбнік.

Рэзалюцыі

прынятыя на Агульным Зьезьдзе прадстаўнікоў Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі ў Вільні дня 13 сьнежня 1931 году.

Зьезд прадстаўнікоў Б. Х. Д. сьцьвярджае, што ў Заходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад уладай Польшчы, не здаволены ўсе патрэбы Беларусаў, як нацыі, у жыцьці народна-палітычным, гаспадарча-эканамічным, самаўрадавым і культурна-асьветным, рэлігійным і іншым.

Апошнія выбары з 1930 г. у Сойм і Сэнат, аб каторых у свой час шырока пісала прэса, давялі да таго, што Беларускі народ з беларускіх земляў ня мае сяньня належнага свайго прадстаўніцтва ў заканадаўчых установах дзяржавы.

На грунце эканамічна-гаспадарчым праводзіцца палітыка большых прывілеяў і выключнага крэдытаваньня польскіх эканамічных арганізацыяў і ўстановаў; паддзержываецца на беларускіх землях польскае асадніцтва і колёнізацыя, зьбіраюцца з беларускага насельніцтва вялікія падаткі, ня гледзячы на нябывалую галіту нашай вёскі. У самаўрадавым жыцьці Беларускі народ ня мае магчымасьці выявіць сваю волю і пастанаўляць у справах датычачых інтарэсаў народна-беларускіх, якія адносяцца да функцыяў самаўраду; а ў культурна-прасьветным жыцьці застасавана супрэчная з духам народнага ўзгадаваньня і пэдагогікі ўтраквізацыя школьніцтва, прычым у такіх школах вучаць польскія вучыцялі, якія часта ня знаюць беларускай мовы, чым ломяць самую аснову ўтраквізму і робяць з утраквістычных школ чыста польскія.

Бяручы пад увагу вышэйсказанае, Зьезд прадстаўнікоў Б. Х. Д. дамагаецца:

I. У жыцьці народна-палітычным: —

а) поўнай свабоды і тайнасьці выбараў у Сойм і Сэнат, каб гэтым даць Беларускаму народу магчымасьць мець сваіх прадстаўнікоў у гэтых найвышэйшых заканадаўчых установах дзяржавы і праз гэта магчы бараніць інтарэсаў Беларускага народу;

б) Зьезд дамагаецца ўсіх правоў, якія належацца Беларускаму народу на падставе канстытуцыі, міравых трактатаў і прыроднага права на існаваньне, як асобнай нацыі.

II. У жыцьці эканамічна-гаспадарчым: —

а) выдачы з дзяржаўнага скарбу доўгатэрміновых крэдытаў на пашырэньне беларускай вытворчай, спажывецкай і крэдытова-ашчадніцкай каапэрацыі;

b) спыненьня польскага асадніцтва і колёнізацыі і правядзеньня справядлівай зямельнай рэформы, пры каторай маглі-б быць надзелены зямлёю беззямельныя і малазямельныя беларускія сяляне;

c) аблягчэньня пры цяперашнім гаспадарчым крызысе, які адчуваецца асабліва на вёсцы, падаткавага цяжару, бо сяляне, пры нячуванай таннасьці сваіх прадуктаў, ня могуць выдзяржаць накладаных дзяржаўных і самаўрадавых падаткаў.

III. У жыцьці самаўрадавым: —

а) Зьезд дамагаецца поўнага і справядлівага самаўраду на беларускіх землях, г. зн. агульных, простых, тайных і прапарцыянальных выбараў у самаўрадавыя ўстановы, бяз ніякага націску з боку адміністрацыйных уладаў;

b) апроч гэтага, Зьезд дамагаецца свабоднага выбару войтаў і ўсіх самаўрадавых функцыянароў, а так-жа незалежнасьці гмінных, паветавых, ваяводзкіх самаўрадаў у сваіх самаўрадавых справах ад цэнтральных і мяйсцовых адміністрацыйных уладаў.

IV. У жыцьці культурна-прасьветным: —

а) Зьезд дамагаецца адчыненьня па ўсей Зах. Беларусі сапраўднага беларускага школьніцтва пачатковага і сярэдняга ў ліку прапарцыянальным да ліку беларускага насельніцтва, а так-жа заснаваньня для гэтага школьніцтва адумысловага беларускага школьнага дэпартамэнту;

b) Зьезд рашуча пратэстуе проціў закладаньня так зв. утраквістычных, польска-беларускіх школ, якія ў практыцы ёсьць найчасьцей школамі польскімі і якія пярэчаць прыроднаму праву кожнага народу. Зьезд уважае, што утраквізм у школах ня толькі не разьвязвае нацыянальнага пытаньня ў галіне прасьветы, але яшчэ болей завастрае народныя антаганізмы;

c) дзеля таго, што дэкрэт Прэзыдэнта Польскай Рэспублікі з дня 29.XI.1930 г., стабілізуючы школьніцтва на нашых землях, не дазваляе ператварэньня польскай школы на школу беларускую праз сэм гадоў ад дня яе адкрыцьця, Зьезд дамагаецца спыненьня перашкодаў да разьвіцьця беларускага пачаткавага школьніцтва і стрыманьня стабілізацыі на беларускіх землях школьніцтва польскага;

d) дзеля адсутнасьці ў нашым краі ўнівэрсытэту, які здаволіў-бы культурныя патрэбы ўсіх народнасьцяў у нашым краю, Зьезд Б. Х. Д. дамагаецца заснаваньня некалькіх беларускіх катэдраў пры цяперашнім унівэрсытэце Сьцяпана Баторага ў Вільні;

e) Зьезд дамагаецца ад ураду вызначэньня стыпэндыяў для беларускай студэнскай моладзі з тым, каб памагчы ёй здабыць вышэйшую асьвету і падзелу гэтых стыпэндыяў не паводле партыйнай прыналежнасьці, а паводле поступу ў навуках і матэр'яльнага палажэньня;

f) Зьезд пратэстуе проціў зачыненьня Клецкай беларускай гімназіі, як аднэй з нямногіх бел. гімназіяў у Заходняй Беларусі;

g) Зьезд дамагаецца аздараўленьня Віленскай і Навагрудзкай бел. гімназіяў, дзе, пасьля пашыраньня камунізму, наступіла пашыраньне дэнацыяналізацыі пасярод беларускай моладзі ў бок польскасьці. Зьезд дамагаецца так-жа ўрадавай помачы для гэтых гімназіяў, бо вучацца там пераважна дзеці бедных бацькоў;

h) Зьезд дамагаецца дзяржаўнай падмогі для беларускіх культурных арганізацыяў з дзяржаўнага бюджэту, вызначанага для фонду народнай культуры, прапарцыянальна да ліку беларускага насельніцтва ў дзяржаве.

V. У жыцьці рэлігійным: —

а) Зьезд прадстаўнікоў Б. Х. Д. рашуча пратэстуе проціў праекту аб увядзеньні цы-
вільных шлюбоў, а асабліва цывільных разводаў, якія будуць падрываць сямейныя асновы
паміж іншымі і беларускага народу, які знаходзіцца ў граніцах Польшчы. Зьезд Б. Х. Д.
пракананы, што хрысьціянскае жанімства ёсьць асновай моцнай сям'і, а моцная сям'я
ёсьць асновай моцнага народу і ўважае гэны праект, як выплад часткі польскага буржуаз-
нага і нерэлігійнага грамадзянства і дзеля гэтых прычын ня можа быць прыняты народам
беларускім;

b) зьезд Б. Х. Д. пратэстуе так-жа проціў тасаванай нацыянальнай палітыкі Віленскіх Духоўных Каталіцкіх уладаў, якою пры помачы Каталіцкага касьцёла польшчыцца беларускае насельніцтва;

с) Зьезд пратэстуе проціў несправядлівай забароны Віленскага Р.-К. арцыбіскупа Р. Ялбжыкоўскага з дня 11.XII.1928 г. належаць каталіком да Б. Х. Д. і чытаць „Бел. Крыніцу." Разам з гэтым Зьезд даручае Цэнтральнаму К-ту выступіць прад Нунцыям Апостальскай Сталіцы ў Варшаве з такімі пажаданьнямі:

1) выдаць загад біскупам у тых дыэцэзіях, у якіх жывуць беларусы, г. зн. Віленскаму
Пінскаму і Ломжынскаму, ужываць у навучаньні беларускага насельніцтва праўдаў веры
Каталіцкай у мове беларускай, а так-жа ўвядзеньня яе ў так зв. дадатковыя набажэнствы;

2) каб падгатовіць да гэтага патрэбны лік духавенства, зьезд просіць увясьці ў сэмі-
нарыі гэтых дыэцэзіяў выкладаньне беларускай мовы, беларускай літэратуры і гісторыі,
пры гэтым у Віленскай і Пінскай сэмінарыі, абслугоўваючых абшары бадай выключна бе-
ларускія, як прадметы абавязковыя, а ў Ломжынскай, дзе лік беларусаў не вялікі, — як
прадметы давольныя;

3) прасіць інтэрвэнцыі ў справе ўзнаўленьня скасаванага ў цэлым радзе парафіяў
(Жодзішкі, Барадзенічы і інш. Віленскай дыэцэзіі) дадатковага набажэнства ў беларускай
мове, а так-жа павароту высланага беларускага духавенства з беларускіх парафіяў у пара-
фіі польскія. Гэтае высыланьне практыкуецца асабліва ў дыэцэзіях Віленскай і Пінскай,
а якое ёсьць супярэчнае з правілам, што духавенства павінна быць у сваім народзе;

4) Зьезд просіць інтэрвэнцыі ў справе вызначэньня ў Вільні асобнага касьцёла для
беларусаў, якія цяпер прымушаны мясьціцца ў адным літоўскім касьцеле, тады, калі паля-
кі маюць у Вільні каля 30 цёх касьцёлаў і некаторыя з іх пустуюць.

с) Разам з гэтым Зьезд даручае Цэнтральнаму К-ту выступіць так-жа прад Праваслаў-
нымі Духоўнымі ўладамі з такімі дамаганьнямі:

1) выдаць загад падуладнаму духавенству, каб ува ўсіх цэрквах на землях з беларус-
кім насельніцтвам была ўведзена беларуская мова;

2) увесьці ўва ўсе праваслаўныя духоўныя сэмінарыі на беларускай тэрыторыі па-
трэбны лік гадзін для вывучэньня беларусазнаўства (беларускай мовы, літэратуры і гісто-
рыі) і для прыгатаўленьня такім чынам патрэбнага ліку праваслаўнага духавенства для
працы пасярод беларускага праваслаўнага насельніцтва.

VI. Аб беларускім жыцьці пад Саветамі:

Зьезд Б. Х. Д. рашуча пратэстуе: —

а) проціў ніштажэньня беларускага народнага і культурнага жыцьця ў Радавай Бе-
ларусі;

b) проціў рэлігійнага ўціску, які там праводзіцца;

с) проціў увязьненьня лепшых культурных беларускіх дзеячоў і высылкі іх з граніц
Сав. Беларусі;

d) проціў загадкавага забойства прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук праф. Ул.
Ігнатоўскага;

е) проціў прымусовага ніщчэньня адвечнага гаспадарчага ладу ў Усходняй Беларусі
і ўводжаньня колектывізму сілаю і гвалтам.

Разам з гэтым Зьезд пратэстуе проціў усякіх спроб з боку міжнароднага фашызму,
і камунізму да[іl]аружнай інтэрвэнцыі, уважаючы яе за пачатак новых падзеўў, новай няво-
лі і новых няшчасьцяў для Беларускага народу. Зьезд Б. Х. Д. дзяржыцца таго прынцы-
пу, што будучыню Беларускага народу ня зможа і не павінен выращаць ані камунізм,
ані фашызм, ані капіталізм, а толькі сам Беларускі народ.

VII. У жыцьці агульна-беларускім:

а) Дзеля таго, што патрэбы беларускага народу ў межах Польскай Рэспублікі нязда-
волены, як гэта відаць з вышэйсказанага, Зьезд прадстаўнікоў Б. Х. Д. прызнае за пра-
вільную тактыку Цэнтральнага Камітэту Б. Х. Д., стаячага ў апазыцыі да польскага ўраду
і праводзячага змаганьне за правы беларускага народу ў жыцьці палітычным, эканаміч-
ным, самаўрадавым, культурна-асьветным і рэлігійным, а асабліва за зямлю і волю.

b) Зьезд заклікае беларускае грамадзянства да аб'яднаньня і стойкасьці ў здабываньні для сябе ўсіх народна-палітычных правоў, а асабліва да ўзмацненьня дарогай самапомачы, г. зн. працай і матэр'яльнай падмогай, сваіх культурна-эканамічных установ і сваёй каапэрацыі. Зьезд Б. Х. Д. перакананы, што толькі гэткай дарогай, побач з арганізаванай працай у самаўрадах, Беларускі народ дойдзе да лепшай долі. Гэтак ішлі далейшыя і суседнія народы, гэтак павінен іесьці і народ Беларускі.

VIII. У справе агульнай перапісі насельніцтва:

с) Зьезд Б. Х. Д. прыняўшы пад увагу справаздачы прадстаўнікоў з мяйсцоў
сьцьвярджае, што пры апошнім сьпісе насельніцтва 9—11.XII г. г. былі стасаваны на бе-
ларускіх землях сьпісаўшчыкамі-камісарамі недапушчальныя мэтады, якія нарушаюць пад-
ставы правапарадку і пярэчаць вольнаму выяўленьню волі нашага насельніцтва, што да
ягонай роднай мовы. Супроць такіх мэтадаў успомненых сьпісоўшчыкаў Зьезд выражае
свой рашучы пратэст.

Антон Сметона ўзноў Прэзыдэнтам Літвы.

Пры прэзыдэнскіх выбарах дня 11-га
г. м. ўзноў выбраны на Прэзыдэнта Літоў-
скай Рэспублікі Антон Сметона. Газэты ўсіх
кірункаў, ня выключаючы нават польска-
эндэцкіх, зазначаюць сваё прызнаньне для
А. Сметоны, як чалавека бязумоўна чэснага
і шчырага літоўскага патрыота, заслугоўвую-
чага на агульную пашану.

Прэзыдэнт Сметона радзіўся ў Вілкамір-
скім пав., у 1874 г., кончыў праўнічы фа-
культэт Пецярбурскага ўнівэрсытэту і прад
вайной працаваў у Вільні ў розных літоў-

З Вільні.

Украінскае прадстаўленьне. У панядзелак 7 г. м. Гурток Украінскіх Студэнтаў віл. унівэрсытэту ладзіў у Вільні ўкраінскае прадстаўленьне: „Ой не ходи Грицю".

Умелае выкананьне артыстаў-аматараў, як і сам сцэнічны твор, у якім выказваюцца тыповыя цэхі ўкраінскага народу, многім віленчуком далі шырэйшае паняцьце аб украінскім народзе і ягонай багатай культуры.

Чытайце і пашырайце „Беларускую Крыніцу!"

З Беларускага жыцьця

Вечары беларускай песьні ў Наваградку і ў Вільні. Надовячы, 4.12 ў Наваградку ў Беларускай гімназіі адбыўся вечар беларускай песьні. Гэты вечар песьні быў наладжаны Бацькаўскім Камітэтам і Пэдагагічнай Радай гімназіі; даход з вечара ахвяраваны для незаможных вучняў гімназіі. Апрача гэтай матэр'яльнай дапамогі для бедных вучняў, вечар беларускай песьні даў вялікае маральнае здаволеньне і слухачу, пачуўшаму родную песьню ў прыгожай гарманічнай апрацоўцы і добра выкананую хорам зарганізаваным умелаю рукою рэгента.

Другі вечар беларускай народнай песьні адбыўся 5 гэтага м-ца ў салі Віл. Беларускай гімназіі, пад кіраўніцтвам умелай рукі грам. Шырмы. Такой духовай стравы віленскія беларусы, а асабліва гімназіяльная моладзь, даўно ня бачылі і ня елі. Пасьля шырока распаўсюджанага на ўсе лады „танго" і ўва ўсіх адменнасьцях пераглумачанага пабеларуску, якім ёсьць цяпер у „модзе" замяняць народную песьню, гэты вечар быў сапраўднай аддушынай у серадовішчы атмасфэры згушчанай тангоўшчыны. У гэты вечар віл. беларускае грамадзянства, а прадусім моладзь, пачула даўно чутую прыгожую і здаровую беларускую песьню. Умелае кіраўніцтва хорам грам. Шырмы, праявіла беларускую песьню, выкананьнем больш 30 асабовага хору, ўва ўсёй красе беларускай народнай мэлёдыі. Гэты вечар даў вынікі больш спадзяваных, бо здаволены і арганізатары вечару і ўчасьнікі, а яшчэ больш гэтага, дык гэта тое, што імпрэза гэта паказала нязьмерную вышшасьць народнай беларускай песьні прад нізасьцяй тлумачаных пабеларуску ўва ўсіх адменах розных кабарэтных напеваў.

Даход з гэтай вечарыны прызначаны для бедных вучняў гімназіі.

Сход супрацоўнікаў „Стыпэндыяльнага Фонду" для беларускага студэнства. У нядзелю 6 г. м. адбыўся сход супрацоўнікаў „Стыпэндыяльнага Фонду" для беларускага студэнства пры Бел. Нац. К-це. Сход адбыўся ў мурах Віл. Беларускай гімназіі ў памешканьні Бел. Студэнскага Саюзу. На сход зышлося 34 асобы спасярод віл. бел. грамадзянства. Сход пасьля доўгай дыскусіі прыняў рэзалюцыю такога зьместу: — „сабраньне заклікае да згоды ўсе беларускія арганізацыі ў справе „Стыпэндыяльнага Фонду" для бел. студэнства і прыступае да папаўненьня камісіі Бел. Нац. К-ту, а так-жа і да высьненьня спосабу зьбіраньня ахвяр на „Стыпэндыяльны Фонд."

Гэтакая пастаноўка справы прысутным на сходзе 2—3 бел. санатарам не спадабалася, — ад імя іх грам. А. Трэпка заявіў, што ён і яго сябры на гэта не згаджаюцца і супрацоўнікамі „Стыпэндыяльнага фонду" для беларускага студэнства ня будуць. Пры гэтым трэба дзеля паўнаты сказаць і тое, што прысутны на сходзе Антон Луцкевіч стараўся пракнанаць прысутных пакінуць супрацоўніцтва ў гэтай справе з Бел. Нац. К-там, але гэта яму не ўдалося і ён з бруднай лаянкай апусьціў салю сходу.

Пасьля высьненьня ўсіх спраў датычачых „Стыпэндыяльнага Фонду", сход выбраў у Камісію „С. Ф." дзеля супрацоўніцтва: — грам. грам. Міхася Тулейку, сьвяшчэньніка Каўша, Малецкага, Войціка, Бурака, Ст. Станкевіча, Пяцюкевіча і Рубіна.

Навуковы рэфэрат аб парлямэнтарызьме ў Вял. Кн. Літоўскім. Дня 6 г. м. у Віл. Унівэрсытэце грам. В. Грышкевіч прачытаў рэфарат на тэму „Сойм Вял. Кн. Літоўскага."

З **жыцьця Б І. Г. і К. на вёсцы.** Гурткі Б.І.Г. і К. у Шутавічах і ў Мур. Ашмянцы, Ашмянскага пав. ладзілі ў сябе беларускія публічныя лекцыі: Шутавічы — ў нядзелю 6 сьнежня, а Мур. Ашмянка — ў аўторак 8 сьнежня с. г. Лекцыі на коопэратыўныя тэмы прачытаў і правёў люстрацыю гурткоў Б.І.Г. і К. віцэ-старшыня Цэнтр. Ураду Б.І.Г. і К. у Вільні інж. Клімовіч.

Захацелася суду чэсьці. На сходзе „Стыпэндыяльнага Фонду для бел. студэнства" прысутны на ім Антон Луцкевіч „абразіўся" на пасла Ярэміча, да якога назаўтра прыслаў сваіх даверанных Трэпку і Грышкевіча, трэбуючы праз іх суду чэсьці ці перапросінаў. Ярэміч на суд чэсьці, рэч ясная,

згадзіўся, але патрэбаваў ад таго-ж Луцкевіча, каб ён сьпярша сам вярнуў утрачаную сваю грамадзкую чэсьць. Ня гледзячы на гэта „Бел. Звон" (№ 24 с. г.) падаў зацемку, што Ярэміч ад суду чэсьці адмовіўся і гэтым самым паступіў не паграмадзку.

Вось-жа ў гэтай справе мы атрымалі ад пасла Ярэміча ліст, які, дзеля высьвятленьня праўды, тут зьмяшчаем:

„Да Грам. А. Трэпкі і В. Грышкевіча.

У адказ на Вашу прапазыцыю даць сваіх прадстаўнікоў дзеля вырашэньня інцыдэнту між мной і А. Луцкевічам на сходзе Камісі Стыпэндыяльнага Фонду для Беларускага студэнства 6.XII сёл. г., або напісаць пісьмо ў прэсе, даючы А. Луцкевічу сатысфакцыю, гэтым заяўляю наступнае:

Я сапраўды на гэным сходзе публічна сказаў, што хоць Луцкевічу рукі і не падаю, то ўсёжтыкі, калі-б сход кооптаваў Яго ў камісію, я быў-бы гатоў з ім супрацоўнічаць. На гэта Луцкевіч крыкнуў з мейсца, што ён таксама не падае мне рукі, на што я сказаў, што ён нявАрт таго, каб я меў падаваць яму руку.

Уважаю, што калі мы ўзаемна публічна заявілі, што адзін другому рукі не падаём, інцыдэнт гэты ёсьць зьліквідаваны.

Пры гэтым дадаю, што калі А. Луцкевіч міма гэтага ўсёж-тыкі ліча сябе абражаным, я гатоў пайсьці з ім на суд чэсьці, але толькі пасьля таго, калі А. Луцкевіч ачысьціцца ад усіх тых закідаў, якія яму зроблены ў беларускай прэсе.

9.XII 31. *(—) Пасол Ф. Ярэміч.»*

Ня ўходзячы тут у тое, хто з успомненых асоб ёсьць у гэтай справе праў, а хто вінават, становішча аднак занятае Ярэмічам, уважаем за бязумоўна слушнае і ўважаць яго за адмову ад суду чэсьці, як гэта разьмінаючыся са зьместам пісьма Ярэміча, зрабілі ў „Бел. Звоне" Трэпка і Грышкевіч, — ніяк ня можна.

Наадварот, з гэтага ўсяго выглядае, што Луцкевіч, ня маючы ніякай надзеі на паварот у беларускім грамадзянстве сваей чэсьці, ад суду чэсьці адмовіўся.

Урачыстае аткрыцьцё „Скарыніі" і яе мэты. 29 XI сёл. г. адбылося ўрачыстае аткрыцьцё польска-беларускай студэнскай арганізацыі. На гэтай урачыстасьці было многа палякоў, а сярод іх так жа хрышчоны бацька „Скарыніі" Антон Луцкевіч.

Мэта гэтай арганізацыі — „ścisła współpraca z polakami", як аб гэтым падалі кіраўнікі яе ў „Sprawy Narodowościowe" (бач. 471, № 4—5, 1931). Усё гэта беларускае грамадзянства павінна ўзяць добра пад развагу.

„Новгородскій чекіст злуецца". Гэткім загалоўкам орган „białorusinów-polaków" „Бел. Звон" (№ 23, 1931) нагароджывае Ф. Акінчыца (перакруціўшы яго на Акінчыка) за яго аднадньёўку „Слова Праўды" (21.XI с. г.), (перакруціўшы яе на „Слова Няпраўды").

Для ўсіх віленскіх беларусаў ясна, што тут гутарка аб Акінчыцы і аб яго аднадньёўцы. А гэтае нязначнае перакручваньне і прозьвішча і назову аднадньёўкі зроблена дзеля таго, каб чалавека ачарніць і ўхіліцца за гэта ад адказнасьці. Сапраўды, якая маральная нягоднасьць!

Або Акінчыц сапраўды чэкіст і тады няма чаго баяцца адкрыта яго такім назваць, калі каму гэтага трэба, або не чэкіст—і тады гэткім імем чарніць яго ні ў якім выпадку ня можна.

Усё-ж гэта, — мусімо ўрэшце сказаць,— адно невялічкае непаразуменьне ідэолёгічна так блізкіх сябе людзей: і кумпанія Луцкевіча з „Бел. Звону" і той-жа Акінчыц—адны і тыя замыя абіваюць парогі „wydziału bezpieczeństwa" Віленскага ваяводзтва.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Ліквідацыя „непрарыўкі". У 1929 годзе саветы ўвялі г. зв. непрарыўны рабочы тыдзень, паводле якога ўсякі работнік меў адпачываць кожны пяты дзень. Такім парадкам фабрыкі, або прадпрыемствы, ішлі бязупынна, бо кожны дзень пятая часьць рабочых была на адпачынку, а рэшта працавала. Гэты „здабытак рэвалюцыі" быў тады абвешчаны як вялікая перамога працы і як ключ да асягненьня пяцігодкі. Аножь прайшло 2 гады і саветы рашылі „непрарыўку" скасаваць і перайсьці на „шасьцідзёнку", у якой кожны шосты дзень будзе агульным сьвятам для ўсіх рабочых, а фабрыкі і прадпрыемствы будуць у гэтыя дні спыняць працу. Такімі днямі будуць 6, 12, 18, 24 і 30 кожнага месяца. У лютым месяцы, у каторым няма 30-га, будзе сьвяточным днём — дзень 1 сакавіка. Гэты новы парадак абавязуе ўжо ад 1 сьнежня. На „непрарыўцы" астаюцца: коопэратывы, трамваі, бальніцы і ўстановы, маючыя грамадзкі характар.

Гэты новы парадак сьвяткаваньня сьведчыць аб тым, што камунізм ня можа ніяк знайсьці правільнага шляху. На наш пагляд і „шасьцідзёнка" тут не паможа, бо яна супярэчна з іншым загадам, які ўстанавіў „сямідзёнку".

Палажэньне настаўніцтва ў Б.С.С.Р. Як мы ўжо пісалі ў нумары 36 „Б. Крыніцы", настаўнікі ў ніж. школах атрымліваюць 90 руб. і ў вышэйшых 130 руб. у месяц. Пры вялікай дарагоўлі ў саветах за гэтыя грошы пражыць трудна. Цяпер сав. газэты падаюць, што ня ўсюды вучыцялі атрымліваюць паёк і так —„у Слуцку настаўнікі апроч хлеба нічога не атрымліваюць, а слуцкае гар-спажыў-таварыства прымацавана іх да такой сталоўкі, якая канчае работу за 2—3 гадзіны да аканчэньня заняткаў у школе".

„У Шулове парашылі арганізаваць для настаўніцтва закрытую сталоўку па... камэрцыйных цэнах. У гэтым-жа Шулоўскім районе настаўнікам не выдавалі прадуктаў харчаваньня за чэрвень — кастрычнік месяцы. Старшыня Дабрынскага сель-спажыў-таварыства прста заявіў: „кожны настаўнік наняў сабе кватэры ў вёсцы ў гаспадара, а таму паёк яму не патрэбны".

Дзеля гэтага няма дзіва, што ў Б.С.С.Р. ёсьць аж 600 вольных настаўніцкіх вакансыяў. Бо хто пойдзе на такое палажэньне; па некаторых районах вучыцель мусіць працаваць апроч гэтага фізычна. Савецкія ўлады імкнуцца цяпер да таго, каб паставіць настаўніка нароўне з рабочымі, што для настаўніка ўжо будзе вялікім шчасьцем.

Якія цэны ў Б.С.С.Р.? „Зьвязда" (№ 306) наракае на ўздуваньне цэнаў. З гэтага наракаьня можам даведацца цэнаў хоць на некалькі прадметаў. І так: дзіцячая кашулька 90 капеяк, шапка — 1 р. 45 кап., кротавае жаночае пальто — каля 200—240 руб., шкарпэткі раней каштавалі 1 р. 95 кап., цяпер 2 р. 10 к., мэтр паркалю даўней 1 р. 48 кап., цяпер 2 руб. і г. д. Як бачым, у савецкім „раі" ня так ужо танна ўсё, як гэта гаворыцца. Трэба помніць, што саветы ў сябе дома на аснове дэкрэтаў 2 рублі лічаць за 1 даляр.

„Таргсін". У савецкіх газэтах чытаем абвесткі, што ў галоўных гарадох (у тым ліку і ў Менску) адкрываюць апошнім часам аддзелы „Торгсіну (Слова „Торгсін" значыць: Таргоўля з інастранцамі). У гэтых „Торгсінах" можна будзе купіць усё, што каму захочацца, але ў заграрічнай валюце. Заграчічную валюту можна будзе высылаць на „Торгсін", паказваючы імя, прозьвішча і адрас тае асобы, на якую высылаюцца грошы. Тая асоба, па атрыманьні паведамленьня з „Торгсіну" аб прыходзе на яе імя грошай, магчыме набраць на тую суму любога тавару, які будзе расцэньвацца ў заграрічнай валюце (далярах). Як чуваць, цэны будуць вельмі высокія; 3—4 разы большыя за цэны нармальныя, аб каторых мы падавалі вышэй.

Апроч крамаў „Торгсіну" адкрываюцца яшчэ так зв. камэрцыйныя крамы, у каторых таксама можна дастаць усяго, але за вялікія грошы. Згэтуль паўстае што-раз большы гнеў і нараканьне рабочых, якія ў сваіх коопэратывах і разьдзельчых пунктах ня могуць дастаць напр. клустасьці ці малака, а ту-ж побач, у камэрцыйнай краме (ужо не гаворачы аб „Торгсіне") чаго хочаш, абы грошы.

Гэтакая палітыка савецкага ўраду тлумачыцца вялікімі фінансавымі труднасьцямі саветаў. Ідзе аб тое, каб дастаць грошы ад насельніцтва і з заграніцы і гэтым ўратаваць дзяржаву ад фінансавага краху. Пры гэтай палітыцы інтэрэсы работніцкай клясы зыходзяць на другі плян. Работнікі такую палітыку свайго ўраду называюць патураньнем буржуазіі.

---

† Сьв. п. Александар БАБЯНСКІ
родам з Ковенскай зямлі, польскі дзеяч, вялікі дэмакрат, вялікі прыяцель беларусаў, адзін з закладчыкаў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, памёр у Варшаве 10.XII с. г. маючы 78 гадоў.
Вечная Яму памяць!
Цэнтральны Урад Б. І. Г. і К.

З студэнскага жыцьця.

Выпіска з пратаколу Агульнага Надзвычайнага Сходу Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні дня 13.XII.31 г.

ПАСТАНОВЫ.

I.

„Дзеля таго, што калі Рэвізыйная Камісія Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні, константуючы шкодную дзейнасьць корпарацыі „Скарыніі" для Саюзу, унесла сьпешную прапазыку аб тым, каб сябром БСС, забараніць належыць да корпарацыі „Скарыніі" і калі гэтая прапазыка была Сходам прынята — сябра „Скарыніі" М. Маркевіч напаў чынна на старшыню Рэвізыйнай Камісіі кал. Я. Шутовіча ў часе спаўняньня ягоных абавязкаў, — Агульны Сход пастанаўляе праз аклямацыі выразіць кал. Я. Шутовічу спачуцьцё і пашану, а М. Маркевіча падаць у Акадэміцкі Суд. Дзеля таго, што корпарацыя „Скарынія" не запратэставала супроць агіднага кроку яе сябры М. Маркевіча, а наадварот, — падтрымала яго, — Агульны Сход пастанаўляе праз аклямацыі абвясьціць байкот для корпарацыі „Скарыніі" і яе сябром не падаваць рукі.

З мэтаю давясьці аб гэтым якнайхутчэй да ведама тых сяброў Саюзу, якія ня былі на ўспомненым Агульным Сходзе, пастаноўлена гэтую пастанову абвесьціць ў прэсе".

II.

„Надзвычайны Сход сяброў Беларускага Студэнскага Саюзу з дня 13.XII.31 г. горача вітае праект Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні што да стварэньня Стыпэндыяльнага Фонду пры Б.Н.К. для незаможнага беларускага студэнства,— дзякуець Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту за апеку над гэтым студэнствам і пастанаўляець падтрымаць акцыю паўстаўшай Камісі Стыпэндыяльнага Фонду заклікаючы сяброў БСС. і ўсіх студэнтаў Беларусаў да браньня чыннага ў ёй удзелу; а тых сяброў Б.С.С., якія ўжо выбраны супрацоўнікамі Камісіі С. Ф. у ейны склад на сходцы з дня 6.XII 31. Сход пастанаўляе ўважаць за прадстаўнікоў Беларускага Студэнскага Саюзу".

Прэзыдыюм Сходу:

Старшыня: (—) Ст. Станкевіч,
Віцэ-старшыні: (—) Т. Куніцкі і Бурак
Сэкрэтары: (—) Я. Малецкі і А. Карпюк.
За згоднасьць (—) Ст. Станкевіч.

З Польшчы.

Узнаўленьне паседжаньняў Сойму. Пасьля месячнага перарыву, паседжаньні Сойму пачаліся 10 г. м.

З заграніцы.

Ваенныя алярмы ў Эўропе. Некаторыя францускія газэты, разглядаючы пляны нямецкіх народных сацыялістаў — гітлераўцаў, алярмуюць на ўсю Эўропу аб небясьпецы вайны. Адна французская газэта піша гэтак: — „Калі-б прыпадкам гітлераўцы ўварваліся на Памор'е, дык Польшча мусіла-б зарэагаваць, а тады Літва пашла-б на Вільню, бальшавікі — на Бэсарабію, заварушылася-б аружна Баўгарыя, Вугрыя, а так-жа і Італія".

Камуністы ўзарвалі царкву Хрыста Спаса ў Маскве. У суботу 5 г. м. а 3-яй гадзіне дня ў Маскве ўзарвана царква Хрыста Спаса. Камуністы загадзя падлажылі пад царкву міны, высялілі з суседніх дамоў людзей, абкружылі царкву здалёку войскам ды паліцыяй і запалілі міну. Ад аднаго ўзрыву прыгожая царква абярнулася ў гурбу грузу. Падчас узрыву забіта шмат людзей.

081530

Ab haspadarcy.

Rybnaja haspadarka. (4)

Pryrodnyja, abo naturalnyja hnai, jak chleŭny hnoj, hnojnaja łužavica (mača) i kampost vielmi silna razbudžajuć rost planktonu ŭ stavie; hnoj kładuć abo na bierah stavu abo na dno, a łužavicu lijuć pa bierazie, abo raspuščanuju z vadoj lijuć u staŭ z łodki. Zialonaje hnajeńnie pad rybny staŭ taksama praktykujecca. Prad hnajeńniem treba abaviazkava adkvasić dno stavu, a pa hnajeńni chlaŭnym hnojem nielha ŭ staŭ napuskać vadu chutčej, jak cieraz dva tydni.

Hnajeńnie stavu naahuł roŭnaznačna z karmleńniem ryby, hnajeńnie ž naturalnymi hnajami, jak chlaŭny hnoj i inš., navat pieravyšaje karmleńnie ryby, bo vytvaraje ŭ stavie vielmi šmat planktonu. A ryba kormlenaja planktonam maje zaŭsiady bolšuju hadaŭlanuju i rynkovuju vartaść, čymsia ryba kormlenaja ŭsiakimi karmavinami samym čałaviekam biespasredna.

h) Haspadarka na rybnych stavoch.

Haspadarku na rybnych stavoch znajemo extensyŭnuju i intensyŭnuju. Extensyŭnaj haspadarkaj naahuł nazyvajem takuju, u katoruju čałaviek pa mahčymaści najmienš starajecca ŭkładać svajej pracy i kapitału i za vyniki (płady) svajho haspadaravańnia zabaviazan pieradusim kaprysnym i niapeŭnym siłam pryrody. U intensyŭnaj haspadarcy — naadvarot — čałaviek — pradpryjemiec układaje značny kapitał — materjalny i razumovy — i šmat pracy.

Extensyŭnaja rybnaja haspadarka maje ŭ asnovie svajej specyjalny pładaźmien (sievazvarot), a intensyŭnaja — apirajecca na štučnym karmleńni ryby. Pryhledźmosia z-bolšaha da pieršaha i da druhoha paparadku.

Stavovy pładaźmien byvaje rozny. N. Borodin padaje hetki 6-cihadovy pładaźmien: try hady pad-rad stavy zalivajucca letam vadoj i słužać dla nasadžyvanych u ich karpaŭ. Prad kožnaj zimoj vada z hetych stavoŭ spuskajecca i dno ichnaje paddajecca vymaražyvańniu. Na čaćvierty hod staŭ pakidajecca suchim i na leta, pryčym na im zasiavajecca łubin. Na piaty hod (druhi pa asušcy) staŭ hnojać chlaŭnym hnojem i ludzkimi exkrementami (adchodami), z dabaŭkaj vapny i kaścianaj muki (fosfar! — A. K.) i siejuć avios na ziernie z kaniušynaj, abo z inšymi travami. Na šosty hod (3-ci pa asušcy) staŭ daje dobry ŭkos travaŭ, atava skormlivajecca skacinaj, abo astajecca na pni i, budučy zatoplenaj viasnoj nastupnaha hodu, zhnivaje i daje bahaty mater'jał dla raźvićcia nižejšych arhanizmaŭ (planktonu — A. K.)."

B. Benecke radzić pładaźmień krychu inšy: stavy stajać pad vadoj u jaho ad 3-och da 5-ci hadoŭ (na zimu adnak rehularna asušajucca!) i zasiavajucca aŭsom, kaniušynaj, cimafiejkaj tolki praz 2—3 hady z tym adnak, kab u apošnim hodzie haspadarskaj abrobki stavišča było dobra pahnojena... Dno stavu pry hetym kareńniami travaŭ razrychlajecca, a samyja kareńni pry navadniańni raskładajucca i słužać rybam—pasredna, abo biespasredna — za stravu.

Intensyŭnaja rybnaja haspadarka palahaje na karmleńni ryby. Treba pry hetym viedać, što ryba daloka lepš adkarmlivajecca, čymsia ciopłakroŭnaja haspadarskaja žyvioła. Adnak ryba nie zaŭsiody zdolna prymać korm: jana prymaje korm tolki tady, kali temperatura vady dasiahnie 18oC. A što jšče cikaviejšaje — pry nižejšaj temperatury kali-b karp i pryniaŭ korm, dyk jon niazdolny hety korm vykarystać.

Dziela ŭsiaho hetaha i para karmleńnia karpa ścisła vyrachavana: robicca heta ad m-ca traŭnia (maja) i ciahniecca pa miesiac vierasień uklučna. Vyrachavana pry hetym, što karp zdolny pryniać u paasobnych miesiacach nastupnyja čaści svajej całaletniaj karmovaj porcyi; u m-cy traŭni — 5 pracentaŭ, u červieni — 20 prac., u lipni — 30 prac., u žniŭni — 35 prac. i ŭ vieraśni — 10 prac. Pavodle hetaj normy i dzielicca ŭvieś korm i zadajecca trejčy ŭ tydzień. Karmiacca ryby z-rana, z łodki, na stałym miejscy, pa mahčymaści volnym ad travy i asabliva — ćviordaści bielnych zaraślaŭ. — Uradžajnaść stavoŭ zaleža pieradusim ad ichnaj jakaści i vynosić 200—500 kg z ha.

Z škodnikaŭ rybnaj haspadarki varta zaciemić ščurej, vodnych myšej, dzikich kačak, rahačoŭ, busłaŭ i inš. vodnych ptušak. — Pierad złodziejskim vyłaŭlivańniem rybnych stavoŭ, asabliva ž stavoŭ daloka ad ludzkoha asiella pałožanych, zabiaśpiečyvajucca haspadary ŭ niekatorych miajscoch zabivańniem u dno stavu padvodnych sukatych kałkoŭ, pieraškadžajučych volna ciahnuć sietku.

i) Perspektyvy rybactva na budučyniu.

Pakulšto planovaja rybnaja haspadarka ŭ nas tolki ŭ zarodku i ŭsie zachady škiroŭvujucca tolki da taho, kab zapaznać jakmaha šyrejšyja kruhi našaha sialanstva z samaj tolki technikaj hadoŭli ryby. Jošć adnak usie danyja dumać i spadziavacca, što chutka i rybny rynak budzie taksama zapłaŭleny, a sama rybnaja haspadarka pierastanie apłačyvacca. Nia budzie heta adnak jašče na doŭhija časy nadpradukcyja, a tolki niesarhanizavanaść rybnaha rynku zbytu, jak heta siahońnia dziejecca z inšymi praduktami ziemlarobstva. Pieršyja łastaŭki hetaha užo jošć: u dni pieradśviatočnyja Vilnia dasłoŭna zapłaŭlena rybaj i jana tut idzie za biazcen, a na pravincyjalnych rynkach (Śviancіany, Ašmiana, Lida, nie havoračy ŭžo ab mienšych) ryby časta susiom niama.

Jašče mała času i na rynku vytrymaje konkurencyju tolki toj, chto maje mienšyja košty vyrabu. Źnižyć-ža hetyja košty možna tolki šlacham arhanizavańnia rybackich supałak, jakija-b mieli za zadańnie supolnymi siłami viaści nerastovyja, hadaŭlanyja i zimovyja stavy, kab nia treba było kuplać za darahija hrošy hadaŭlanuju rybu, dy kab nia treba było pradavać uvosieni za biazcen vyhadavanuju rybu, a mahčy jaje zachavać u sadkach ci ŭ zimachovach da lepšaj cany ŭzimku. abo i až na viasnu. Dalej, takija supałki mieli-b za zadańnie dastaŭlać svaim siabrom usich patrebnych dla rybactva pryładaŭ, sietak i inš., śladzić za rybnymi rynkami i nie dapuskać, kab adny rynki byli pierapoŭnieny i abiazcenivalisia, a druhija — haładavali. Da najhałaŭniejšych zadańniaŭ takich supałak treba zaličyć taksama i pašyreńnie fachovaj rybackaj viedy, kab u čas i na miejscy karystać z usich zdabytkaŭ ludzkoha rozumu: heta najpeŭniejšaja zbroja ŭ zmahańni z sučasnaj halitoj našaj pieradusim biełaruskaj vioski.

Rybactva pobač z lonam, tkactvam, hančarstvam, cahlarstvam, zabaŭkarstvam, kašykarstvam, pčalarstvam, malarstvam, harodnictvam, hadoŭli chatnich ptušak (kurej i inš.), śviniej, a zdajecca ŭ niedalokaj budučyni i matyla-šoŭkaprada, musić stacca adnym z dachodniejšych zaniatkaŭ našaha drobnaha biełaruskaha sialanstva.

inž. A. K.

Пісьмо ў Рэдакцыю.

Вельмі паважаны
Грамадзянін Рэдактар!

Не адмоўце, калі ласка, надрукаваць наступнае.

У № 1 „Голаса Прав. Беларуса", зроблены мне закід аб маей салідарнасьці з студ. С. Сарокаю. У сувязі з гэтым паясьняю, што шчырасьць, ідэёвасьць і адданасьць, якія выяўляў да гэтае пары студ. Сарока да Праваслаўя, не маглі нікога сапраўды праваслаўнага кампрамітаваць.

Што датычыць спосабу барацьбы гэтае ідэёвае натуры з некаторымі асобамі праз выданьне аднаднёвак, то асабіста я гэты спосаб барацьбы публічна некалькі разоў асудзіў у газэтах „Время" і „За Свободу" у 1930 г. Публічнае асуджэньне маю аднаднёвак сьцьверджана і ў „Беларускім Звоне" ад 10 сакавіка г. г. за № 5. Таксама некалькі разоў як у вышэй успомненых газэтах, так і ў „Воскресном Чтеніи" я на падставе афіцыяльных асьведчаньняў Б. П. Камітэту заяўляў, што з ім не супрацоўнічаю. Камітэт падтрымоўваўся газэтаю „Наперад", як гэта відаць з № 7 гэтае часопісі.

Найлепшым доказам безпадстаўнасьці закідаў „Голасу Прав. Бел." аб маім „удахнавіцельсцьве" Камітэту ці аднадвёвак служыць наступная выпіска з дакладу „Белцэнтрасаюза" Блажэньнейшаму Мітрапаліту Дзіянісію ад 10 кастрычніка 1930 году:... „Закіды Епархіяльнае улады, быццам сьвяшчэньнік А. Коўш стварыў Камітэт і супрацоўнічае ў ім, ці зьяўляецца адказным за аднаднёўкі належыць з агідаю адкінуць тым, хто іх высоўвае..."

Калі неафіты з „Голасу Прав. Белар." не цікавіліся дагэтуль царкоўнымі справамі і ня чыталі ні „Воскреснаго Чтенія", ні іншых газэт, то хаця-ж не забываліся-б аб тым, аб чым яшчэ так нядаўна пісалася ў „Беларускім Звоне", „Нaперадзе" і ў афіцыяльным дакладзе, бо-ж сапраўды, паўстае пытаньне: да каго адносяцца словы „належыць з агідаю адкінуць тым, хто іх высоўвае"...

Маё прывітаньне пасьля фактычна апраўдаўчага судовага выраку ідэёвага студ. Сарокі палягала не на антыхрысьціянскай ненавісьці і імкненьні пакараць людзей у вастрогі, а на Хрыстовай любові і літасьці і да грэшнікаў.

З пашанай сьвяшчэньнік (—) А. Коўш.

Да нас пішуць.

НОВАЯ ЭРА.

Слонім. Я ўжо няраз пісаў, што каля Слоніма жывуць тысьцюсенькія беларусы, пераважна праваслаўныя. Ёсьць каля Слоніма многа і беларусаў каталікоў, якіх польскія шовіністы ўважаюць за палякоў. Нацыянальная сьведамасьць сярод тутэйшых беларусаў даволі моцная. Але ў царкве і ў касьцеле беларушчыны ня чуваць. У царкве пануе расейшчына, а ў касьцеле польшчына. Такім чынам нашы беларусы праваслаўныя „рускай" веры, а беларусы каталікі „польскай" веры. Гэты рэлігійны падзел глыбока дзеліць наш народ духова, накіроўваючы адных у Маскву, а другіх у Варшаву. Гэнае зьявішча, рэч ведамая, не натуральнае, а дзеля гэтага і шкоднае для нашага народу.

Дзеля гэтага трэба нам шукаць спосабу, які-б не дзяліў духова наш народ, а яго злучаў і мацаваў. А гэтым злучэньнем духовым зьяўляецца рэлігійная унія. Вось каля Слоніма ў Альбэртыне ўніяты і пачалі гэтае вялікае дзела для нашага народу. Яны злучаючы наш народ у еднасьць рэлігійную заводзяць у царкве беларушчыну г. зн. каб наш беларус далей не калечыў сваей душы. Дык вось гэтая новая эра для нашага народу вельмі карысная і мы мусім імкнуцца яе асягнуць.

А п а н а с.

КРЫХУ АБ БЕЛАРУСКАЙ ПРАЦЫ І ІНШЫХ СПРАВАХ У НАШАЙ ВАКОЛІЦЫ.

Будслаў, Вялейскага пав. Нядаўна наш Будслаўскі гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ладзіў у нашым мястэчку беларускае прадстаўленьне.

Прадстаўленьне адбылося ў гміннай салі. Адыграны жарт „Зьбянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча. На прадстаўленьне зышлося людзей каля 100 асоб. У нас наагул заўсёды ўсе адносіліся да праявы беларускасьці прыхільна і ахвотна заўсёды памагалі беларускай справе ахвярамі ды купляньнем білетаў на беларускія прадстаўленьні. Цяпер ужо ня тое, але гэтаму вінаваты цяжкі гаспадарчы крызыс, а ня людзі. Дзе там цяпер селяніну да ахвярнасьці на беларускую справу, калі і солі купіць няма за што, бо сялянскі прадукт ужо нічога ня варты. Але нашы людзі хоць з апошняга, хоць і ня ўсе, беларускай справе памагаюць. Прад прадстаўленьнем было зышоўшыся вельмі многа людзей у гмінную салю — чакалі лектара інж. Клімовіча, які меўся прыехаць з Вільні чытаць лекцыю аб беларускай культуры і гаспадарцы, але не дачакаўшыся разышліся. Прадстаўленьне агулам адбылося ўдала.

У вёсцы Вераб'ёх Будслаўскай гміны ёсьць польская школа з гарачай польскай вучыцелькай. Гэтая пані недалюблівае беларускасьці і прабуе адстрашаць нашу моладзь ад беларускай працы. Але нашы хлопцы ўжо страшаныя, дык пастрахаў пані вучынелькі не баяцца і ад беларускай справы не ўцякаюць.

У в. Дзямідках так-жа Будслаўскай гміны, паліцыя з войтам „ускрашаюць" няжывы гурток польскага „Кулка Рольнічэго." Гэнае „kółko" два гады таму няжывым нарадзілася, праз увесь час ня жыло, дык мусіць і цяпер не парушыцца, хоць п. камандант паліцыі з войтам і чухаюць яго, каб як колечы ажывіць.

Б у д с л а ў с к і.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.